НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

№ 12 (102), ЛІПЕНЬ 2010 ГОДА

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

## КАБ АПРАЎДАЦЬ ДАВЕР НАРОДА

Амаль два гады таму прыступіў да выканання абавязкаў дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Віцебскай сельскай выбарчай акрузе № 21. Як вядома, ім стаў віцебскі чыноўнік ад камітэта прыродных рэсурсаў В. М. Байкоў. Тады ў ходзе выбарнай кампаніі, згодна з афіцыйнамі данымі Васіль Міхайлавіч нібыта набраў на Шуміліншчыне 87, 8 працэнтаў галасоў. А на “выбары” загналі 92,1 працэнт жыхароў раёна, якія маюць права голасу. Не сакрэт, што дэпутатаў гэтак званай “Палаткі” прызначае сам кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка. Менавіта такі давер вымагае ад дэпутата часта наведваць наш раён. Тым больш, што ў передвыбарнай праграме В. М. Байкоў абяцаў прымаць такія законы, якія будуць абараняць правы і інтарэсы грамадзян. А яшчэ ў праграме Васіля Міхайлавіча быў дэкларыраваны такі пункт : “от социальных стандартов – к социальному комфорту”. “Продолжить совершенствование приоритетов государственной политики по обеспечению граждан качественным и доступным жильём.” Выходзіць так, што за плячыма гэтых паважаных людзей ужо ёсць напрацаваны вопыт і аўтарытэт па забяспячэнню насельніцтва якасным жыллём. А для таго, каб дэпутаты працавалі аператыўна і зладжана, трэба рэгулярна, не меней, як раз у квартал праводзіць выязныя сустрэчы з выбаршчыкамі. Апошні раз дэпутат Байкоў пабываў у Шуміліне 7 ліпеня. У малай зале райвыканкама быў наладжаны чарговы прыём грамадзян па асабістых пытаннях. Аднак на гэты раз ніводнага пытання па будаўніцтву жылля не разглядалася. Наадварот, людзей хвалявалі тыя праблемы жылога фонду, дзе яны пражываюць ужо нямала гадоў. Усе скаргі былі па пытаннях капітальнага рамонту і камунальнага абслугоўвання жылля. Як заўсёды, гаворка вялася вакол невырашальных праблем на раённым узроўні. Жанчыны з вуліцы Вакзальнай Г. Салаўёва і Т. Кляцкова былі незадаволены працай работнікаў камунгаса. На іх погляд, камунальнікі бяруць занадта высокую плату за ацяпленне. Маўляў, жыхары суседніх дамоў плацяць удвая менш. Як высветлілася, каб зменшыць затраты, патрэбны рамонт цеплатрасы. Праект готовы, але дзе ўзяць 300 мільёнаў рублёў? Жахарка райцэнтра З. Селязнёва скардзілася на пастаянныя парывы суседніх камунікацый. Рамонтнікі перакрываюць ваду і яе не бывае па некалькі дзён. На вуліцы Юбілейнай ля дома 47 няма ліўневай каналізацыі, але куды падзець дажджавую ваду – ніхто не ведае. Былі і “дзіўныя” звароты. Да прыкладу, жыхар А. з Шуміліна наадрэз адмовіўся плаціць шумілінскаму камунгасу грошы за вываз смецця. А тая плата за месяц усяго крыху больш за тысячу рублёў. Пры гэтым В. М. Байкоў з горыччу зазначыў, што некаторыя грамадзяне са сваімі дробязнымі сваркамі толькі ствараюць перашкоды дзяржаве будаваць нармальнае жыццё. У каторы раз да дэпутата В. М. Байкова звярнуўся былы дырэктар механічнага завода Т. М. Тарыма. Да гэтага часу мікрараён жылога сектара каля СШ № 1 пакутуе ад прагніўшай каналізацыі. Рамонт пачалі, але хутка спынілі – скончыліся сродкі. У свой час камунальныя службы абяцалі вырашыць гэту праблему ў мінулым годзе. В. М. Байкоў папракнуў камунальнікаў у няшчырасці і заклікаў гаварыць людзям праўду, якая б яна непрыемная ні была. Калі няма грошай, дык няма чаго даваць людзям пустыя абяцанкі. Работнікі ўсіх службаў павінны быць больш адкрытымі для насельніцтва, каб людзі разумелі мясцовую ўладу, раіліся, сумесна шукалі рашэнні. Тады і давер будзе. А пакуль што большасць нашых выбаршчыкаў зацікаўлены ў вырашэнні сваіх асабістых праблем. Яны да тае пары так і не зразумелі, чаму іх вядуць на выбары, і куды, каго і для чаго яны выбіраюць. У прадстаўніках вышэйшай заканадаўчай улады яны бачаць усяго толькі больш высокае начальства, якое, па іх глыбокаму перакананню, павінна падганяць мясцовых чыноўнікаў. Як савецкая, так і цяперашняя постсавецкая ўлада іх да гэтага прывучылі. Чым самі і ўскладнілі сабе працэс кіравання дзяржавай. Без сумневу, людзей трэба вучыць будаваць не толькі дамы, але і прымаць удзел у дзяржаўным будаванні ўсіх галін улады. Тады к дэпутатам будуць хадзіць з прапановамі ўдасканаліць заканадаўства, а не з просьбамі заляпіць дзіркі ў гнілой канілізацыі.

**А. Шчамлёў.**

## АДЗІН ПАКЕТ МУКІ НА ДЗЕСЯЦЬ ЧАЛАВЕК

Камісія з райвыканкама праводзіла чарговы рэйд па гэтак званых неблаганадзейных сем’ях, якія стаяць на ўліку. Першую сям’ю з вёскі Добрына правяралі ўчастковы інспектар РАУС В. Воранаў і метадыст аддзела адукацыі І. Пастарнакава. Тут агледзелі ўмовы пражывання дваіх дзетак. Іх бацька раней учыняў п’яныя скандалы, яго некалькі разоў забірала міліцыя. Сітуацыя выправілася, дзецям пачалі купляць адзенне, у халадзільніку былі прадукты. Затым удзельнікі рэйду аб’ехалі яшчэ дзевяць сем’яў на тэрыторыі Лаўжанскага сельсавета. На момант праверкі ўсе бацькі аказаліся цвярозымі. Аднак умовы пражывання дзяцей мала чым адрозніваліся ад папярэдніх. Бацькі піць кінулі, але ад гэтага не пабагацелі. Яскравы прыклад сельскай беднаты камісія пабачыла ў вёсцы Пабеда. Тут у адной маладой мнагадзетнай сям’і, што жыве з бацькамі, гадуецца пяцёра дзетак. Халадзільнік быў пусты, а на кузні правяраючыя знайшлі… адзін пакет мукі. Да таго ж у хаце жыў госць – пляменнік. Вось і атрымліваецца, што на дзесяць чалавек маладой гаспадыні давядзецца рабіць пачастунак з аднаго пакета мукі. Ці дапаможа ў гэтым выпадку Дэкрэт “ 18 аб узмацненні кантролю за нядбайнымі бацькамі? Наўрад ці ён накорміць людзей. А работнікаў райвыканкама ён прымушае зноў праз некаторы час лазіць па пустых шафах і адключаных лядоўнях збяднелых жыхароў нашага раёна.

**С. Горкі.**

## ПАСЛАНЦЫ ПРЭЗІДЭНТА Ў ШУМІЛІНЕ

Узмацненне вертыкалі ўлады аўтарытарным рэжымам Аляксандра Лукашэнкі прывяло да таго, што яго памагатыя напладзілі процьму ўсялякіх правяраючых органаў. Часам здаецца, што Беларусь – краіна кантралёраў. Апошнім часам самі ж бюракраты прыдумалі гэтак званы прынцып аднаго акна, які не даў жаданага выніку. Бясспрэчна, у рабоце са зваротамі грамадзян большасць праблем застаецца нявырашанымі. А тут яшчэ і прэзідэнцкія выбары не за гарамі. Даследванні палітолагаў паказваюць, што рэйтынг мясцовай улады самі нізкі ў нашай краіне. Гэта не выпадкова. Простая логіка падказвае, што калі дзе-нідзе прадстаўнікі мясцовай улады будуць карыстацца высокім даверам ў насельніцтва, то што тады будзе з папулярнасцю галоўнага кіраўніка краіны? Вось ён і паслаў сваіх непасрэдных кантралёраў разбіраць цэлыя завалы са зваротаў грамадзян у рэгіёны. Праводзіць пазапланавыя праверкі ў наш раён прыбылі прадстаўнікі рэспубліканскіх міжведамасных груп. 13 ліпеня кіраўнік адной з міжведамасных груп А. Э. Краўцоў праводзіў асабісты прыём грамадзян. Акрамя таго, для правяраючага чыноўніка была наладжана і “гарачая лінія”. У гэты дзень Алег Эдуардавіч прыняў дзесяць чалавек і выслухаў каля трыццаці званкоў шумілінцаў. Насельнікі нашага раёна зноў-такі прыйшлі да начальніка з больш высокай інстанцыі са скаргамі на дрэнныя бытавыя ўмовы пражывання. У сваю чаргу А. Э. Краўцоў падцвердзіў, што гэта сітуацыя тыповая для ўсіх раёнаў краіны. Паставіў на від нашаму райвыканкаму заўвагу пра тое, што яго кіраўнікі недапрацоўваюць па захоўванню тэрмінаў разгляду зваротаў людзей. Выявіў той факт, што наша мясцовая ўлада недастаткова інфармуе людзей аб плануемых рамонтных работах. Як паведаміў дырэктар Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь А. Э. Краўцоў, міжведамасная група не будзе вырашаць у рэгіёнах канкрэтныя пытанні. Асноўная задача групы – палепшыць работу мясцовых чыноўнікаў, дапамагчы ім больш глыбока ўнікнуць у праблемы жыхароў раёна. Дарэчы, прычыны валакіты , абмежаванай інфармаванасці грамадзян з боку кіраўніцтва і несвоечасовае выкананне рамонтных работ сталічны візіцёр не ўказаў. А магчыма, галоўная прычына палягае ў тым, што мясцовыя бюджэты пустыя?

**Алесь Шумскі.**

## Няма аддачы за першае паўгоддзе

Кіраўніцтва дзяржавы цвердзіць, што на Беларусі няма эканамічнага крызісу. І сапраўды, прадпрыемствы працуюць, беспрацоўя няма, незадаволеных няма – на дэманстрацыі ніхто не выходзіць. Гэта ў тых краінах, што ў еўразоне, часта здараюцца дэфолты, масавыя банкруцтвы банкаў і прадпрыемстваў. А такія краіны Еўрасаюза як Грэцыя, наогул ахоплены масавымі беспарадкамі: беспрацоўныя патрабуюць адстаўку Урада і ўступаюць у бойку з паліцыяй. А ў нас ціха. Гэта ў іх там, на Захадзе, капіталісты з рабочым людам не цырымоняцца, калі няма капітала – дык няма і працы. А на Беларусі пабудавана сацыяльна арыентаваная эканоміка, найперш усё робіцца для чалавека, астатняе – потым. Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка забараніў закрыццё заводаў і скарачэнне працоўных. У гэтай складанай сітуацыі ўдалося ўтрымаць эканоміку, не дапусціць абвалу. Але ж аптымістычны настрой не мае пад сабой трывалага падмурка: з прагнозных паказчыкаў у многіх рэгіёнах краіны выканана толькі частка, бюджэт недаатрымаў значную суму грошай. Не выключэннем стаў і Шумілінскі раён. На падвядзенні вынікаў за першае паўгоддзе з трынаццаці зацверджаных прагнозных параметраў раён выканаў усяго два. Аб няпростым эканамічным становішчы ішла размова на апошнім пасяджэнні раённага выканаўчага камітэта, якое прайшло 19 ліпеня. З аналітычным дакладам выступіла намеснік старшыні райвыканкама В. А. Байда. Лічбы былі прыведзены несуцяшальныя. Усе сельгаспрадпрыемствы не выканалі заданне па росту аб’ёма вытворчасці валавой прадукцыі. Самыя буйныя прадпрыемствы раёна – Обальскі керамічны завод і Шумілінскі льнозавод таксама не выканалі ўстаноўленыя дзяржавай паказчыкі па аб’ёму прамысловай прадукцыі. Да таго ж не дасягнулі неабходнага росту параметры інвестыцый у асноўны капітал. Адпаведна і па энергазберажэнню: па-ранейшаму засталіся нізкія паказчыкі. Нестабільная работа гандлю: не выкананы ўстаноўленыя паказчыкі па росту аб’ёма рознічнага тавараабароту, па аб’ёму экспарту тавараў. Старшыня райвыканкама В. А. Падляшчук быў незадаволены такімі фактамі і строга спытаў з адказных асобаў. Вальдэмару Антонавічу было незразумела, чаму кіраўнікам на месцах даюць дастаткова тэхнікі, насення, рабочых, а параметры дагэтуль не выконваюцца. Некаторыя кіраўнікі ўсё ж спрабавалі апраўдацца: старшыня праўлення райспажыўтаварыства В. В. Доктараў патлумачыў прычыну нестабільнай работы арганізацыі –на месцах не хапае кваліфікаваных кадраў. Намеснік начальніка райфінаддзела А. І. Лебедзева паведаміла прысутным аб паступленнях у бюджэт. За студзень-чэрвень у раённы бюджэт паступіла 7664 мільёны рублёў (42,3%) да гадавога плана. Як бачна, бюджэт пакуль што пабагацеў не так, як было запланавана. Увогуле, у цяперашняй сітуацыі зараз розныя эканамічныя паказчыкі (асабліва валавыя) або параметры самі па сабе мала што азначаюць. Цяпер трэба не проста за лічбамі гнацца, а атрымліваць прадукцыю і грошы за яе рэалізацыю. За станоўчую дынаміку ў параметрах крэдыты ў банку не дадуць. Апроч таго, трэба скарачаць выдаткі, каб плаціць работнікам прыстойны заробак. І напэўна, трэба менш прымяняць да падначаленых адміністратыўныя меры пакарання, а то каб не разбегліся апошнія спецыялісты.

**Я. Вайтовіч.**

## “СВІТАНАК” У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале http://kamunikat.org/, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamunikat.org/svitanak.html , што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.**




## АБ’ЯВА

***• Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску.***

***• Рэдакцыя « Світанка » змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.***

***• Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанак».***

***• Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

# СВЯТА СТАЛІНСКІХ НАШЧАДКАЎ

3 ліпеня ў Шуміліне, як і па ўсёй Беларусі праходзіла свята. Працавалі гандлёвыя кропкі, былі арганізаваны выставы, працаваў наш шумілінскі "Горад майстроў", пад адкрытым небам падрыхтавалі музей "Беларуская хатка", на пляцоўках у парку ладзілі канцэрты – самадзейныя артысты танцавалі, спявалі песні. Увогуле, творчасць нашых людзей не мае абмежаванняў. Свята ёсць свята, і простыя людзі асабліва не думаюць, каму і для чаго яно патрэбна. Дала ўлада яшчэ адзін выхадны, падкінулі крыху грошай – ешце, піце, весяліцеся, ну чаго яшчэ трэба ад жыцця абываецелю? Усё было б добра, аднак кожны самастойна мыслячы чалавек абавязкова будзе задаваць шэраг пытанняў сабе і грамадству: чаму ўлада Лукашэнкі так зацыклілася на 3 ліпеня? Чаму менавіта 3 ліпеня Лукашэнка і яго атачэнне абазвалі Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь? Незалежнасць ад каго? Ідэолагі постсавецкага рэжыму прыкрываюцца адзіным аргументам: 3 ліпеня – дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Іх савецкі правадыр, былы дырэктар саўгаса Аляксандр Лукашэнка недарма сёлета ў сваёй прамове казаў, што Беларусь – адзіная краіна на постсавецкай прасторы, якая не вядзе адлік свайго суверэнітэту з часоў падпісання аб гэтым дэкларацыі. І з гонарам дадаў пра тое, што любы, нават самы важны дакумент – простая папера, калі за ім не стаіць сіла і воля народа. Але ж аб самавольных адносінах рэжыму да Канстытуцыі і наогул да законаў усе ведаюць. Гэта не галоўнае. Галоўнае – чаму адлік "незалежнасці" гэтай улады пайшоў ад 3 ліпеня 1944 года? Па сутнасці, у той час Беларусь была распята акупантамі з абодвух бакоў: з Захаду захоплена Германскім Рэйхам, з Усходу – Савецкай Расеяй. Нацысцкі дыктатар Гітлер з дапамогай бальшавісцкага тырана Сталіна дзялілі паміж сабой Усходнюю Еўропу, але кожнаму паказалася мала і яны перагрызліся паміж сабой. Што чырвоны скарпіён загрыз карычневага тарантула – справа дзесятая. Беларускаму народу ні тады, ні цяпер не дазволілі зрабіць самастойны выбар. Пад маскай "вызваліцеляў" на Беларусь вярнуліся расейскія бальшавікі, якія загналі наш народ у калгасны ГУЛАГ. Сапраўднай палітыкай тырана Сталіна было знішчэнне карэнных беларусаў, высяленне жыццёвай прасторы і засяленне яе прышлымі элементамі, адкідамі расейскага грамадства: карумпіраванымі чыноўнікамі , валацугамі, крымінальнікамі, п'яніцамі, бамжамі, адстаўнымі вайскоўцамі. Гэта палітыка працягваецца і зараз. Вось чаму марыянетачны прамаскоўскі рэжым забараніў святкаваць сапраўдны Дзень Незалежнасці баларускага народа 25 сакавіка. У гэты дзень пасля амаль двухсотгадовай расейскай акупацыі ў 1918 годзе была абвешчана Незалежнасць Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР). Прыняццём АКТУ 25 САКАВІКА 1918 году быў завершаны доўгі гістарычны шлях нашага народа да адраджэння беларускай дзяржаўнасці і дэмакратычных свабодаў у Беларусі. Не выпадкова Лукашэнка так грэбліва казаў пра паперкі, якія не гарантуць волі народу. Сітуацыя безвыходная: у яго няма законных паўнамоцтваў на кіраванне крайнай, пасля таго, як ён ужо адбыў свае два тэрміны. Каб утрымліваць уладу гвалтоўна, аўтарытарны рэжым вымушаны выціраць кожны дзень ногі аб законы, якія самі і напісаў. Цяперашнія грамадзяне Беларусі мусяць памятаць, што сучасная Расея не адмовіцца ад сваіх планаў захапіць Беларусь. І будзе рабіць гэта рукамі сваіх прызначэнцаў – Аляксандра Лукашэнкі і яму падобных. Дарэчы, каб не высакародныя ідэалы БНР, то і Лукашэнка не ведаў бы, хто ён па нацыянальнасці і да якой нацыі належыць. А калі б жыў у адной з шасці расейскіх губерній, то пажыццёва цягнуў бы лямку калгаснага брыгадзіра. Так што штучна прыдуманае ідэолагамі рэжыму свята незалежнасці 3 ліпеня не мае пад сабой ніякай гістарычнай асновы і навязана беларускаму народу гвалтоўна. Маргінальная квазідзяржава РБ – з'ява часовая і абавязкова развaліцца пасля падзення рэжыму. Таму што яна не мае нацыянальнай ідэі. А без нацыянальнай ідэі ні народ, ні дзяржава доўга існаваць не могуць.

**А. Шчамлёў.**

ВЯДОМЫЯ ЗЕМЛЯКІ

# Даследчык роднага краю

В. В. Улюценку больш насельнікаў нашага раёна ведае як добрага ўрача-тэрапеўта. А тыя, хто цікавіцца фальклорам і краязнаўствам, ведаюць Віктара Васільевіча як таленавітага даследчыка шумілінскага краю, гісторыка і пісьменніка. Цяпер В. В. Улюценка мае за плячыма багаты творчы багаж, у якім галоўнае месца займаюць краязнаўчыя матэрыялы, паўчальныя сказы пра адвечныя чалавечыя каштоўнасці і нататкі пра прыроду – пра рэчку, пра яр, пра валун. Згадзіцеся, не кожны бачыць, у чым непаўторнасць таго ці іншага яра або валуна. А ён бачыць і адкрывае вочы іншым. І берагчы тое, што падарыла нам непаўторная беларуская прырода. Работы Улюценкі ведаюць не толькі ў раёне, але і ў вобласці і рэспубліцы. Усяго ім напісана 70 прац краязнаўчага характару. Усё пачалося з дзяцінства. Вясковы хлопчык з Крупчына, што каля Шуміліна, часта бавіў свой вольны час у лесе , полі і на возеры. Адметнае месца ў яго жыцці займала паэзія і наогул мастацкае слова. Яно пастукала ў сэрца вучнёўскай парой, будучы дзевяцікласнікам ён змясціў у раёнцы свой першы верш "Ручай". Першая спроба натхніла юнака, і калі ён вучыўся ў Полацку пачаў нястомна пісаць. Творчы ўзлёт наступіў тады, калі Віктар уступіў у літаб'яднанне "Блакітны разліў", якім кіраваў саратнік Якуба Коласа Павел Пруднікаў. Паступова пачаў пісаць нарысы і нататкі пра запаведныя месцы нашага краю. Не выпадкова і псеўданім сабе выбраў – Антон Параскевін. На месцы былой царквы Святой Параскевы-Пятніцы, зруйнаванай савецкімі ўладамі, з'явілася каплічка, куды прыязджаюць за святой вадой. Адсюль і псеўданім, " сын самай малой на свеце крыніцы", на святой Пяценцы. Многія яго краязнаўчыя даследаванні ажыццяўляе хрысціянства. Няма тут нічога штучнага, усё ў суладдзі: хіба нашы дзяды маглі абыйсціся без веры, без царквы? Некалькі газетных публікацый адзначыў уладыка Філарэт, падпісаўшы падзячны ліст Віктару Улюценку. Ацанілі Віктара Васільевіча і на шматлікіх конкурсах. У рамках Рэспубліканскага экалагічнага форуму за нарыс "Краіна Белаяр" яму прысуджана другое месца. Гэта важкае прызнанне, калі ўлічыць, што ў конкурсе ўдзельнічала 65 аўтараў, якія прадставілі на суд журы 187 работ, то мы можам ганарыцца сваім земляком. Зараз Улюценка даследуе гісторыю прамбыткамбіната, Шумілінскага вакзала, доўга працуе ў архівах, каб нарэшце дастукацца да праўды з Халакостам у Сіроціне. Нядаўна выйшла яго першая кніга з сімвалічнай назвай "Светлазор". Няхай не стоміцца, б'е гэта крыніца святла і дабра. Яго прачулае слова нам патрэбна, як гаючая сіла крыніцы з яго роднай Пяценкі.

**Алесь Прыбярэжны.**

# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ АДСВЯТКАВАЛІ І Ў ВІЦЕБСКУ

**20 гадоў таму 27 ліпеня 1990 году Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце. Да рэферэндума 1996 года гэта было найгалоўнейшае дзяржаўнае свята– Дзень Незалежнасці. Блізу сарака віцебскіх грамадскіх актывістаў сабраліся ў парку імя Фрунзе, каб ушанаваць гэтую святочную падзею.**

Не толькі ўлада і дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі ніякім чынам не ўзгадалі пра былы Дзень Незалежнасці, але і звычайныя віцебчукі выявілі поўную абыякавасць з гэтай нагоды.

І не гледзячы на тое, што з ініцыятывы гарадской арганізацыі БНФ і сябраў кампаніі " Гавары праўду", побач з плошчай Свабоды на беразе Віцьбы свята адбылося, яго фармат не адпавядаў значнасці падзеі здзейсненай два дзесяцігоддзі таму.

Першым слова ўзяў старшыня абласной філіі БНФ Кастусь Смолікаў. Ён распавёў пра тое, што ўлады не далі дазвол на правядзенне свята ў парку культуры і адпачынку імя Савецкай Арміі, таму замест мітынгу адбудзецца сяброўская сустрэча прыхільнікаў сапраўднай незалежнасці. Спадар Смолікаў выказаў сваё стаўленне да гэтай падзеі і перадаў слова грамадскай актывістцы Ніне Кавалёвай, якая зрабіла невялікі экскурс у тысячагадовую гісторыю беларускай дзяржаўнасці, а затым правяла віктарыну, прысвечаную жыццю і творчасці беларускага паэта Уладзіміра Някляева.

Грамадзяне, падзеленыя на дзве каманды( каліноўцы і скарынаўцы), адказалі на большасць пастаўленых пытанняў, а затым спелі пад акампанемент добрага беларускага барда з Бешанковічаў Георгія Станкевіча дзве некляеўскія песні. Пераможцы атрымалі прызы і воплескі ўдзячнасці ад прысутных.

Як і належыць сапраўднаму беларускаму паэту-барду, спадар Георгій сваімі патрыятычнымі і непаўторнымі спевамі здолеў разварушыць слухачоў і надаў святу пэўную ступень урачыстасці і значнасці. Сярод гарадскога тлуму, у самым цэнтры Віцебска на высокай ноце прагучалі з дзесятак ягоных песьняў пра Беларусь, родную бешанкавіцкую зямлю, беларускую мову, мінуўшчыну і будучыню. Барду было не проста змагацца з шумам транспарту і расейскімі спевамі, што гучна далятаюць з дынамікаў, размешчаных на плошчы Свабоды, але ён здужыў і не саступіў ані ноты, ані інтанацыі. Здужыў, як некалі купка бэнээфаўцаў здужыла тую дэнацыяналізаваную агрэсіўную камуністычную большыню з Вярхоўнага Савету 12 склікання і дамагласа прыняцця Дэкларацыі незалежнасці.

Зможам і мы той абсурд і бяспраўе, што пануюць у нашай краіне.

Разыходзіліся прысутныя ў добрым настроі і са спадзевамі на немінучыя перамены.

Міліцыя паводзіла сябе спакойна. За развіццём падзей сачылі два амапаўцы і падпалкоўнік Кастрычніцкага РАУС Андрэй Іваноў.

**С. Жук.**

# МІЛІЦЫЯНЕРЫ ЗБІЛІ ХЛОПЦА ЗА ШОРТЫ, САКОЛКУ І СЛАНЦЫ

**Малады чалавек быў апрануты сапраўды гэтак жа, як злачынец, якога шукалі вартавыя парадку.**

Інцыдэнт адбыўся ў Віцебску ў сераду, 21 ліпеня.

24-летні малады чалавек разам са сваёй маці вяртаўся дадому з паліклінікі, дзе праходзіў медкамісію. Двое мужчынаў у цывільным кінулі яго на зямлю, надзелі наручнікі і заштурхалі ў машыну. Яны прадставіліся супрацоўнікамі крымінальнага вышуку і паведамілі, што малады чалавек апрануты ў такую ж саколку, шорты і сланцы, як аб'яўлены ў вышук забойца. Пасля таго, як супрацоўнікі міліцыі праверылі дакументы маладога чалавека, яны адпусцілі яго, але выбачэнні яму прынеслі толькі на наступны дзень, у абласной управе ўнутраных справаў.

У Першамайскім РАЎС, супрацоўнікі якога ўдзельнічалі ў затрыманні «забойцы», праводзіцца праверка.

**Ян Сведка.**

# ДОМ РАМЁСТВАЎ У "ГОРАДЗЕ МАЙСТРОЎ"

3 сапраўдным славянскім размахам адшумеў сёлета чарговы "Славянскі базар" у Віцебску. Не менш як пяць тысяч гасцей амаль з сарака краін свету прымаў горад на Дзвіне. Як заўжды, людна было ў "Горадзе майстроў". Творчыя і таленавітыя людзі прывезлі на выставу свае вырабы. Па даўняй традыцыі, ніводзін фестываль не праходзіць без удзелу ў яго мерапрыемствах калектываў Шуміліншчыны. Вось і сёлета два дні былі майстры і з нашага раёна. Шумілінскі Дом рамёстваў выставіў на кірмашы ганчарныя, лазовыя і саламяныя вырабы, лялькі. Ганчарнымі вырабамі гандляваў майстар з пасёлка Обаль Яўген Наважылаў. Прыемна, што ў намінацыі "За традыцыйнасць і культава-абрадавае прызначэнне" у абласным конкурсе стала пераможцам майстар па саломапляценні Наталля Сцяржанкова.

**С. Горкі.**

# РОСТ ЗЛАЧЫННАСЦІ

За першае паўгоддзе бягучага года ў нашым раёне зарэгістравана 135 злачынстваў (на 10 больш, чым летась). Праўда, не было цяжкіх злачынстваў: разбояў, забойстваў і замахаў на забойствы. Пачасцілася колькасць крадзяжоў у гэтым годзе – 79 супраць 72 мінулагодніх. Спякота ўнесла свае карэктывы: людзі на працяглы час пакідаюць адчыненымі вокны, дзверы, сыходзяць з дому, пакінуўшы свае рэчы без нагляду. Гэтым і карыстаюцца злодзеі. На азёрах крадуць мабільнікі. Пакуль гаспадары купаюцца, мабільныя тэлефоны знікаюць. Не даюць спакою самагоншчыкі: ужо канфіскавана ў аматараў зялёнага змея 3795 літраў самагону і самагоннай брагі, 83 літры спіртаўтрымліваючай вадкасці. Атруціліся няякасным алкаголем і памерлі пяць чалавек. У лячэбна-працоўныя прафілакторы сёлета адпраўлена 19 чалавек, якія пакутуюць на алкагалізм. Працягваецца акцыя "Мак–2010". Каля вёскі Мішневічы спынілі аўтамабіль "Рэно-Лагуна". Пры аглядзе знайшлі макавую саломку. Заведзена крымінальная справа. Вадзіцелю, ураджэнцу Арменіі пагражае да пяці гадоў турмы.

**У. Арэшкін.**

# “ЗАПЛЯНАВАНА РАСЕЙСКАЯ СТАНЦЫЯ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ”

**Расея адмаўляецца ад падпісаньня пакету пагадненьняў аб будаўніцтве АЭС, пакуль ня будзе створана сумеснае прадпрыемства для збыту электраэнэргіі.**

Пакет дакумэнтаў пра будоўлю АЭС уключае ў сябе пагадненьні аб узьвядзеньні АЭС, аб выдзяленьні крэдыту і аб паралельнай працы энэргасыстэм дзьвюх краін. Расейскі бок выпучыў умову, каб да пачатку будоўлі АЭС было створана сумеснае прадпрыемства па збыце электраэнэргіі. Аднак з гэтым не пагаджаецца беларускі бок.

Яшчэ адна ўмова расейскага боку — каб расейская доля ў СП складала ня менш за 50%. То бок Расея прэтэндуе на палову прыбыткаў ад збыту электраэнэргіі зь беларускай АЭС, калі яе збудуюць за кошт расейскага крэдыту. І хоць краіны на ўзроўні гаспадарчых суб’ектаў знайшлі варыянты вырашэньня спрэчнай сытуацыі, пазыцыя кіраўніцтва ўраду Расеі застаецца нязьменнай. У «Расатаме» заяўляюць: маўляў, «як толькі расейскі прэм’ер дасьць адмашку, пагадненьне будзе падпісанае».

Камэнтуючы гэтую сытуацыю, эканаміст Міхась Залескі адзначыў, што расейцы робяць так, як яны плянавалі, бо заплянавана расейская станцыя на беларускай зямлі:

«Гэта пасьлядоўнае дадушваньне свайго сатэліта і васала да той пазыцыі, у якой ён, па расейскай задумцы, павінен знаходзіцца. Гэта забіраньне сабе. Мы дазваляем табе мець у нашай станцыі на тваёй зямлі 50%. Гэта прынцыпова для Расеі з тае прычыны, што 9 мільярдаў — памер крэдыту, які просіць Беларусь — іх насьцярожвае. Ім здаецца, што частка гэтых грошай будзе выкарыстана нямэтава. Для таго, каб мець поўны кантроль над фінансавымі плынямі падчас будаўніцтва і эксплюатацыі АЭС, яны цяпер ужо патрабуюць свайго 50%-га ўдзелу. Каб на роўных кантраляваць як паступленьне сваіх грошай на сваю станцыю, так і выкарыстаньне сваіх грошай на сваёй станцыі».

Раней кіраўніцтва Беларусі заяўляла, што пакет пагадненьняў аб пабудове АЭС будзе падпісаны да канца ліпеня. Цяпер, з улікам прынцыповых рознагалосьсяў, яго падпісаньне застаецца няпэўным.

Беларусь пляную ў 2018 годзе ўвесьці ў эксплюатацыю два блёкі АЭС і разьлічвае атрымаць на будаўніцтва расейскі крэдыт на 9 мільярдаў даляраў.

**Алесь Дашчынскі.**

# «АСОБА І ЧАС»: ЛАРЫСА ГЕНІЮШ

***У Мінску выйшаў з друку біяграфічны альманах «Асоба і час» цалкам прысвечаны Ларысе Геніюш. Нагодай выдання альманаху стаў 100-гадовы юбілей славутай паэткі. Над укладаннем зборніка працаваў паэт Міхась Скобла.***



Упершыню ў Беларусі выйшаў біяграфічны альманах, прысвечаны адной асобе, і радасна, што гэтай асобай стала Ларыса Геніюш. У альманаху друкуецца шмат яе невядомых твораў, друкуецца каля сотні невядомых здымкаў, вельмі багаты раздзел успамінаў, шмат лістоў як самой Ларысы Геніюш, калі дакладна - 182 лісты, і каля сотні лістоў адрасаваных паэтцы такімі знакавымі асобамі, як Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Максім Танк, Аляксей Карпюк.

У асобным раздзеле альманаху змешчаны архіўныя матэрыялы з Прагі, адшуканыя Францішкай Сокалавай, у якіх адлюстраваны моманты выкрадання Ларысы і Янкі Геніюшаў з Прагі, што рабілася незаконна. У выданні таксама друкуецца каля 20 невядомых вершаў паэткі. Прэзентацыя альманаху адбудзецца 7 жніўня ў Зэльве.

**К чорту гарэлку, шэйкі і твісты...**

*К чорту гарэлку, шэйкі і твісты,*
*Юную голаў хлусьнёю кружыць!*
*У сэрца народу скіраваны выстрал,*
*Жыць яму заўтра, альбо ня жыць...*
*Мовай ня нашай заплавілі горад,*
*Ціхіх сялянак ня лічаць людзьмі,*
*Нельга ўліваціца ў чужацкае мора*
*Юнасьцю нашай, крывёю, дзяцьмі.*
*Нельга. Мы ўдома свае, а ня сьведкі.*
*Няпрошана злыдні абселі сталы,*
*Кідаюць «з ласкі» свае нам аб’едкі,*
*Плодзяць халуйства на нашай зямлі.*
*Мы — стража ля нашай народнай калыскі.*
*Вораг суровы і лёс наш круты,*
*У нас за плячыма крычаць абеліскі,*
*З крыўдаю ў сэрцы падходзяць браты.*
*Мы сёньня лёсу Радзімы зарука,*
*Выканаць нам, што бацькі не змаглі.*
*У нас запытаюць з дакорам унукі*
*Аб волі, аб мове радзімай зямлі.*
*Сёньня ж на пласе родная мова,*
*Вырваць жывую належыць з агню,*
*Слова «кахаю» – слабае слова,*
*Мужнае слова – абараню!!!*

**Ларыса Геніюш.**

# СУСТРЭЧЫ МІЛІНКЕВІЧА: «КАЛІ Я ВЫІГРАЮ ВЫБАРЫ, ДЗЯРЖАВА ДАСЦЬ ЛУКАШЭНКУ МАЛЕНЕЧКІ ДОМІК, ПРА ЯКІ ЁН МАРЫЦЬ»

***Напярэдадні старту прэзідэнцкай кампаніі лідэр руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч распачаў паездкі па рэгіёнах. Адна з першых сустрэч адбылася ў Салігорску. У размове з прадстаўнікамі грамадскасці палітык расказаў пра тое, як ён ставіцца да абрання адзінага кандыдата ад апазіцыі, пра дапамогу рэпрэсіраваным і пра тое, якім будзе лёс Лукашэнкі, калі ён прыйдзе да ўлады.***

## Калі я стану прэзідэнтам…

— Калі я выіграю выбары, дзяржава дасць Лукашэнку маленечкі домік, пра які ён марыць, — запэўніў карэспандэнта “Салідарнасці” Аляксандр Мілінкевіч. — Калі ён не рабіў ніякіх злачынстваў, яму падзякуюць за тую працу, што ён рабіў — добрую ці кепскую. І няхай сабе жыве. Калі ён рабіў злачынствы, то, як і кожнаму чалавеку, яму прыйдзецца адказваць перад законам. Я не суддзя і не пракурор. Я катэгарычна не прымаю гэту ўладу, таму што яна прыніжае чалавека. Я не крыважадны чалавек. Не буду абяцаць, што вось гэтых я павешу, а гэтых расстраляю, а гэтых звольню.

Першым сваім указам прэзідэнт Мілінкевіч адменіў бы кантрактную сістэму:

— Кантракты існуюць ва ўсім свеце, але ў нас кантракт створаны спецыяльна, каб на чалавека нагнаць страх, трымаць яго ў абсалютным падпарадкаванні. І ў той форме, якой ён ёсць, кантракт прыніжае чалавечую годнасць.

## Уявіце сабе саме страшнае: заўтра мы перамаглі

— Я не баюся вам паказацца чалавекам, які думае, разважае. Я не хачу ўлады, для мяне крэсла — гэта сродак. Я не імкнуся да ўлады, каб украсці два мільярды або забяспечыць дзецей. Я хачу іншую Беларусь. У мяне няма дакладнай стратэгіі, як перамагчы на выбарах. Упэўнены, што мы пераможам толькі тады, калі пераможам у галовах людзей.

Нам здаецца, што адыйдзе дыктатура, і адразу наступіць вялікае шчасце, і будзе свабода і дабрабыт. Самае вялікае выпрабаванне будзе на працягу першых паўгода-года пасля таго, як мы возьмем уладу. Вельмі цяжка ўладу рэалізаваць, таму што досведу у нас мала. Мой сябар кажа: “Уявіце сабе самае страшнае: заўтра мы перамаглі”.

## Пра вонкавую падтрымку апазіцыі

— Без вонкавай падтрымкі ў дыктатуры не выжывеш. Актывісты польскай “Салідарнасці”ісённякажуць, што калі б не было велізарнай фінансавай падтрымкі звонку, не перамаглі б яны камуністычную ўладу. Таму не трэба саромецца вонкавай падтрымкі, калі яна ідзе на дэмакратыю.

## Пра адзінага кандыдата

— Я лічу, што важна аб’яднаўваца ў апазіцыі на пэўных маральных каштоўнасцях. Я сам быў адзіным кандыдатам — і дзякуючы гэтаму стаў вядомым – і хацеў бы, каб на гэтых выбарах быў абраны адзіны кандыдат. Але ўявіце сабе: сядаем мы — 15 прэтэндэнтаў — і кажам: “Хто б ні быў адзіны кандыдат, мы усе працуем на яго”. Я не магу з гэтым пагадзіцца, таму што мне мала таго, што мы ўсе супраць Лукашэнкі. Калі абраны кандыдат выступае за аб’яднанне з Расіяй, я не змагу з ім працаваць. Я б не баяўся, калі б у апазіцыі былі дзве кааліцыі паводле геапалітычных прэферэнцый.

## — На каго б з прэтэндэнтаў у кандыдаты вы б не працавалі ў выпадку абрання гэтай персоны адзіным кандыдатам ад апазіцыі?

— Я не буду адказваць персанальна на гэтае пытанне з прычыны паліткарэктнасці. Але я не буду працаваць на кандыдата, для якога ня ёсць каштоўнасцямі тое, што для мяне самае важнае: дэмакратычная краіна, незалежная, якая абірае шлях у Еўропу. На чалавека, які падзяляе гэтыя каштоўнасці, я гатовы працаваць, калі яшчэ шчыра паверу, што ён гэта хоча рэалізаваць.

## Пра дапамогу рэпрэсіраваным

— Я ніколі не прыму папрока, што мы пасля 2006 года не імкнуліся дапамагчы максімальна тым, хто пацярпеў. У Польшчы і зараз каля трохсот студэнтаў вучыцца і атрымліваюць стыпендыі, большыя за польскіх студэнтаў. Праграмай Каліноўскага я ганаруся. Нядаўна ў мяне была размова з польскім урадам, і мне абяцалі, што гэтая праграма будзе нават тады, калі вы пераможаце. У нашай базе каля двух тысяч чалавек, рэпрэсіраваных пасля 2006 года. Мы не ўсіх знайшлі і не ўсім дапамаглі. Мы зрабілі тое, што маглі, і мне не сорамна за гэта.

Калі я стану прэзідэнтам, абавязкова зраблю ўсё, каб кампенсіраваць людзям гады рэпрэсій, якія яны пражылі без працы, адсядзелі ў турмах. Гэта абавязак новай ўлады. Я і сам стаў беспрацоўным у 2000 годзе, калі пачаў кампанію Домаша. Мяне папрасілі з універсітэта. Таксама хачу кампенсацыю (смяецца).

**Таццяна Гусева.**

# Плохие «Вести» для Лукашенко

Интервью Михаила Саакашвили белорусскому государственному каналу вызвало шквал критики со стороны российских политиков и СМИ. НТВ показал фильм «Крестный батька-2». Первый российский канал показал сюжет, посвященный требованию белорусских оппозиционеров привлечь Лукашенко к ответственности по фактам, изложенным в первой части фильма. А «Россия» ударила дуплетом.

**Вслед за НТВ и Первым российским к информационной войне против Александра Лукашенко подключился телеканал «Россия». «Он ведет себя как предатель» – таков лейтмотив сюжетов.**

Сперва в программе «Вести» появился сюжет «Грузинский реверанс Александра Лукашенко», в рамках которого российские политики дружно осудили показ по БТ интервью Михаила Саакашвили. Даже руководитель КПРФ Геннадий Зюганов, долгие годы защищавший главу Беларуси в любых ситуациях, сказал: «Я могу выразить только сожаление, что человека, у которого по локоть руки в крови, принимают в братской Беларуси, которую я очень люблю и уважаю».

– Нет никаких сомнений, что сценарий этому эпизоду (интервью – прим.ред.) писал лично Александр Григорьевич, – уверен Николай Левичев, руководитель думской фракции «Справедливой России». – Саакашвили – это агрессор, который развязал братоубийственную, кровавую войну, которому места в политической жизни – в будущей политической жизни – нет. Если Александр Григорьевич Лукашенко передумал и имеет иное мнение на этот счет, я уверен, что белорусский народ даст в свое время этому оценку. Любой политический хамелеон уходит с политической сцены бесславно.

Чуть позже канал «Россия 24» выдал в эфир интервью члена Общественной палаты при президенте РФ Николая Сванидзе. Тот расценил пресловутое интервью, как «большую фигу», публично показанную России и российскому руководству.

– Он (Лукашенко – прим.ред.) стал гадить и хамить России по каждому поводу, – заявил Сванидзе. – Он ведет себя как предатель.

Не остаются в стороне и печатные СМИ. «Московский комсомолец», к примеру, помимо ряда статей разместил на своем сайте видеоролик, на котором картинку с преступлениями фашистов сопровождена аудиорядом – Лукашенко хвалит Гитлера.

Сам Лукашенко во время поездки по Гомельской области все обвинения прокомментировал весьма лаконично: «Мы не будем отвечать грязью на грязь». При этом он разразился очередной порцией критики в адрес Кремля и выразил уверенность: «Россия больше боится потерять Беларусь, чем мы боимся потерять Россию».

Впрочем, потерять Лукашенко Россия, похоже, уже не боится. Вышеупомянутый сюжет «Вестей» заканчивался таким комментарием: «Через полгода в Беларуси выборы. И Лукашенко, кажется, сжигает мосты. Но непохоже, что на этот раз будет легко перейти вброд. Это в прошлые годы, получая дешевый российский газ, Минск сосредоточил в экономике пятьдесят миллиардов долларов. Но Москва так больше не хочет...»

**Вадим Ливнев.**

# БЕЛСТАТ РАСКРЫЛ СТОИМОСТЬ ВЕНЕСУЭЛЬСКОЙ НЕФТИ

***Первая партия венесуэльской нефти обошлась Беларуси в 656 долларов за тонну.***

Согласно данным Национального статистического комитета, Беларусь в мае 2010 года импортировала 79,8 тыс. тонн нефти из стран дальнего зарубежья по цене 656 долларов за тонну.

Напомним, в мае Беларусь получила первый танкер нефти из Венесуэлы. Стоимость венесуэльской нефти власти не раскрывали, заявляя, лишь, что её переработка является рентабельной.

«Страна покупает нефть у Венесуэлы «по хорошей цене». Если покупать российскую нефть со стопроцентной пошлиной, Беларусь несет убыток, а на венесуэльской нефти – выигрывает. На нефти, которую мы привезли из Венесуэлы, мы заработали, а это плюс, а не минус», — сказал буквально две недели назад первый вице-премьер РБ В.Семашко.

Для сравнения стоимость импортированной из России нефти, согласно данным Белстата, составляет 398 долларов за тонну.

Согласно договоренностям Александра Лукашенко и Уго Чавеса, Минск планирует закупить у Каракаса 4 млн. тонн нефти в 2010 году и 10 млн. тонн — в 2011 году.

Прибытие четвертого танкера с венесуэльской нефтью (около 80 тыс. тонн) в порт Одессы ожидается 17 июля. Он также как и другие три, будет переработан на Мозырском нефтеперерабатывающем заводе. Пятый танкер будет поставлен в Беларусь через Эстонию в третьей декаде июля и переработан на Нафтане.

# БІЗНЭС-ІМПЕРЫЯ ПРЭЗІДЭНТА

Што ж уваходзіць у гіганцкую імперыю, падкантрольную асабіста кіраўніку дзяржавы? Па афіцыйных падліках, ажно 80 арганізацый маюць груваcткі давесак да назвы, які ўказвае на гаспадара, — «Кіраўніцтва справаў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Сайт Кіраўніцтва справаў адзначае, што набор «птушанят»-небараак пад прэзідэнцкае крыло пачаўся ў сярэдзіне 90-х, калі шэраг прадпрыемстваў культурніцкага профілю былі стратнымі. Мэта была адна — захаваць прадпрыемствы для будучыні. Фабрыкі мастацкіх вырабаў, кераміка, сувеніры — сапраўды, падтрымка ім была неабходная. Але не адной керамікай жыло ўпраўленне справамі.

**Гандаль ад імя дзяржавы — вось асноўная крыніца прыбытку.**

Кампанія пад някідкай назвай «Беларусьгандаль» дае такі абарот грошай, што іншым і не снілася. Імпарт алкаголю, цыгарэт і лесу — шматмільярдны заклад паспяховасці аптовага прадпрыемства. І такія арганізацыі яшчэ і атрымліваюць зніжкі «для бедных»! Напрыклад, увоз «Беларусьгандлем» каменнага вугалю ў краіну ў гэтым паўгоддзі нават не будзе абкладацца падаткамі.

**Адпачынак пасля доўгай, напружанай працы**

Кіраўніцтва справаў прыбрала да рук санаторыі за межамі краіны, якія дасталіся ў спадчыну ад БССР. Туапсэ, Друскенікі, Ялта, Сочы, Юрмала…

Гаворка аб іх продажы не заводзілася нават у часы самай нястачы. Пра санаторыі і дамы адпачынку ўнутры Беларусі і казаць не варта. «Юнацтва», «Баравое», «Сосны» — раней сюды ездзілі лячыцца па дармовых пуцёўках прафсаюзнікі, цяпер — стомленыя ад турэцкіх і егіпецкіх пляжаў расіяне.

Турыстычны аператар «Цэнтр-Курорт» вызначае, ці выдзеліць ахвотным пуцёўкі ў пералічаныя вышэй санаторыі. Таксама арганізацыя валодае больш за дзесяццю аптэкамі ў сталіцы.

**Нацыянальныя паркі, офісы, латарэі — такому набору пазайздросціў бы мільярдэр. Кіраўніцтва справаў прэзідэнта Беларусі — арганізацыя, якая жыве сама па сабе. Яе кіраўнікі, у народзе іх завуць «прэзідэнцкія заўхозы», трымаюць на нітках самыя прыбытковыя галіны эканомікі. І па тых самых нітках перакачваюць мільённыя прыбыткі падкантрольных арганізацый. Камусьці там ўдавалася лепш, камусьці, як сумнавядомай Галіне Жураўковай, у якой выявілі растрату 3,6 мільёна USD, — горш.**

РУП «Беларускія латарэі» застаецца найбуйнейшым гульцом латарэйнага бізнэсу, прапануючы дваццаць гульняў. Галоўны брэнд «Ваша лато» працягвае змаганне з «Суперлато» Дзмітрыя Лукашэнкі, але ў кампаніі ёсць яшчэ іншыя гульні, і тыражныя, і імгненныя.

**Нацыянальныя прэзідэнцкія паркі**

У краіне налічваецца пяць нацыянальных паркаў — «Белавежская пушча», «Нарачанскі», «Прыпяцкі», «Бярэзінскі» і «Браслаўскія азёры». Усе гэтыя ўнікальныя прыродныя аб'екты ў сярэдзіне 90-х трапілі пад кантроль КСП.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка любіць паўтараць, што паркі былі перададзеныя Кіраўніцтву справаў своечасова. Маўляў, толькі так удалося захаваць іх у першасным чыстым выглядзе.

Так ці не, але карупцыя у парках квітнее. З таго часу колькасць арыштаваных кіраўнікоў паркаў пастаянна расце. У адным толькі Браслаўскім нацпарку трое прызначаных дырэктароў па чарзе ішлі пад суд. Усіх іх — прызначаных асабіста прэзідэнтам — абвінавачвалі ў перавышэнні службовых паўнамоцтваў. План па вырубцы ў Белавежскай пушчы, адстрэл зуброў — усё гэта таксама факты апошніх гадоў.

**«Прэзідэнт-гатэль». У гасцях у прэзідэнта**

На цяперашні момант КСП валодае трыма сталічнымі гатэлямі. Самы прэстыжны — чатырохзоркавы «Мінск», які стаіць на самой плошчы Незалежнасці. «Планета» і «Юбілейная» маюць «усяго» тры зоркі, дый знаходзяцца далей ад цэнтра. Кампенсаваць недахоп зорнасці мусіць «Прэзідэнт-гатэль», які ўзводзіцца ўдарнымі тэмпамі ў суседнім квартале з рэзідэнцыяй кіраўніка дзяржавы.

З іншага боку ад яго размяшчаецца «лечкамісія» — элітная бальніца на чале з Ірынай Абельскай.

**…Будаўнічыя трэсты, эксперыментальныя калгасы, гандлёвыя цэнтры** — вось няпоўны спіс таго, што засталося па-за нашай увагай. А ёсць жа яшчэ і Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці, які вырашае, ці мае права патрыяцць якія-кольвечы грашовыя пераводы з-за мяжы…

А якія прыбыткі прыносяць офісныя будынкі па ўсім Мінску, якія Кіраўніцтва справаў у свой час забрала сабе амаль у поўным складзе. Ёсць не просяць, а арэнду прыносяць.

Для параўнання, пад кантролем упраўлення справамі прэзідэнта Украіны налічваецца 50 арганізацый. У агромністай Расіі — 105 арганізацый, але дзясятак з іх — гэта дзіцячыя садкі.

Сапраўдныя гандлёвыя абароты беларускай бізнэс-імперыі ніколі не абнародваліся. Па сведчаннях былога заўхоза Івана Ціцянкова, нават у яго часы, у канцы 90-х, прыбыткі ішлі на мільярды даляраў.

**Віталь Несцераў, «Наша ніва».**

# Совбез вытащил грязное белье ДФР

***Совбез выявил факты того, как в ДФР КГК выводили из-под уголовного преследования бизнесменов. Но публичной стирки не будет – опорочивших себя высокопоставленных сотрудников рекомендовано просто уволить.***

Как ранее писал «Ежедневник», весной нынешнего года, после назначения нового директора Департамента финансовых расследований Комитета государственного контроля, Совет безопасности начал крупную проверку органов финансовых расследований. Проверка уже прошла и подведены первые итоги, которые оказались несколько обескураживающими.

С одной стороны, Совбез выявил факты, дающие основание предполагать, что весьма влиятельные ныне сотрудники ДФР КГК совершали странные процессуальные действия, позволяющие бизнесменам уходить от уголовной ответственности. С другой стороны, по этим фактам не предлагается принимать никаких решений.

Сами итоги проверки заняли без малого 200 страниц текста. Пересказывать все не имеет смысла, но на некоторые моменты все же стоит обратить внимание.

Так, Совет безопасности обратил внимание на крайне низкую работу с негласными источниками информации оперативного управления ДФР КГК. По мнению проверяющих, это обусловлено низким профессиональным уровнем отдельных сотрудников. Об этом много раз говорилось и раньше, но впервые было признано официально. И действительно, после того, как из ДФР КГК был уволен заместитель директора Евгений Мочайло, оперативная составляющая органов финансовых расследований, являвшаяся его самым сильным звеном, была отодвинута фактически на самый последний план. Ушли десятки опытных сотрудников, а оставшиеся отдали в подчинение пришлым людям, не имевшим опыта в финансовых расследованиях. И если раньше ДФР КГК активно подпитывал своей оперативкой другие правоохранительные органы, то теперь стал сам активно использовать их наработки.

К следствию у Совбеза также много претензий. За последние три года в следственном управлении ДФР КГК существенно снизилась эффективность работы. Если ранее «пшиком» заканчивалось 18,3 процента возбужденных дел, то теперь их количество увеличилось более чем в два раза. Это говорит о том, что весьма часто дела стали возбуждаться без достаточных на то оснований, для "галочки", чтобы показать свою работу.

Одним из самых красивых показателей работы Департамента финансовых расследований КГК было в последнее время возмещение ущерба, которое происходило в ходе расследования. Цифры вроде как год от года росли, что позволяло руководству департамента и Комитета госконтроля говорить об эффективности работы. Но от этой отчетности Совбез также не оставил камня на камне. В абсолютных цифрах возмещение действительно росло, а вот в процентах более значительными темпами падало.

Во время проверки сотрудники Совбеза установили, что еще 21 марта 2000 года Дмитрий Адамович, будучи старшим следователем, возбудил уголовное дело в отношении двух бизнесвумен. 2 октября 2000 года он приостановил предварительное расследование по делу за розыском одной обвиняемой. Лишь 5 августа 2009 года (спустя почти 9 лет!!!) расследование было возобновлено, а спустя две недели прекращено за истечением сроков давности привлечения к уголовной ответственности. При этом женщина, которая якобы находилась в розыске, все это время официально (с пропиской) жила в Минске, откуда никуда не выезжала. Мало того, за прошедшие 9 лет она сменила не одно место работы, о чем имеются соответствующие отметки в трудовой книжке. Естественно, у Совбеза возникло подозрение: уж не ради ли того, чтобы прошел срок привлечения к уголовной ответственности, приостанавливалось это расследование? Совбез особо указал на это обстоятельство и еще отметил, что со второй обвиняемой вообще никаких процессуальных действий не было проведено. Пока напарница якобы находилась в розыске, ее никто ни разу не вызвал на допрос или даже беседу. Более того, даже в постановлении о прекращении предварительного расследования она никак не фигурирует, словно вообще к делу не причастна.

Подобных фактов Совбез выявил не один и не два. Дела приостанавливались под различными предлогами (до получения экспертизы, в связи с розыском обвиняемого, до получения ответа на международный запрос и т.д.), а потом о них просто забывали на такой срок, по истечении которого следователь мог на законном основании расследование прекратить. Так, например, одно дело было приостановлено на 6 лет и было возобновлено только после того, как из Уголовного кодекса в законодательном порядке была исключена соответствующая статья, что декриминизировало деяния двух обвиняемых.

Возникает вопрос: каким образом дела просто так хранились в сейфах 6 или 9 лет и выскакивали оттуда точно в тот срок, когда их можно прекратить? Совет безопасности хоть и выявил эти факты, но не дал им никакой коррупционной оценки и даже не предложил в оперативном порядке их изучить. Даже бизнесмены, которым удалось так счастливо избежать уголовной ответственности, не были опрошены на предмет коррупционных связей со следователями ДФР КГК. И это притом, что по многим фамилиям следователей в КГБ и Совбезе уже имеется оперативная информация об их слишком шикарном материальном обеспечении.

По всей видимости, Совбез просто не хочет накануне президентских выборов раздувать столь крупный скандал, желая провести лишь тихую кадровую чистку финансовой милиции и Комитета государственного контроля. Как удалось выяснить «Ежедневнику», в Администрации президента уже направлена рекомендация об увольнении нескольких знаковых фигур, но решение по этому вопросу пока не принято. Между тем сами эти фигуры, предчувствуя беду, от греха подальше отправились в отпуска.

Как дальше будут развиваться события, станет ясно в течение ближайшего месяца, когда по итогам проверки Совбеза будет дана окончательная оценка деятельности ДФР КГК за последние три года.

**«Ежедневник».**

# Кто в Беларуси получает меньше минимума

***К концу пятилетки каждый белорус должен иметь зарплату, как минимум, в 250 долларов, пообещал президент на третьем Всебелорусском собрании в марте 2006 года. Пока же минимальная зарплата в Беларуси – примерно 259 тысяч рублей.***

В 2005 году зарплата в 250 долларов была в Беларуси средней. «Я убежден, что спустя 5 лет сможем сказать, что каждый имеет 250 (долларов – ред.), а средняя будет около 500. Если мы выполним параметры, которые заложены в программе. А у нас есть для этого все», -- сообщил тогда участникам собрания президент.

Сегодня 250 долларов -- это примерно 750 тысяч рублей. Такую зарплату не получают пока в Беларуси представители многих профессий. Более того, есть целая отрасль, которая даже в среднем все еще не достигла рубежа в 250 долларов -- это соцобеспечение. Здесь средняя заработная плата в июне 2010 года составила 742 тыс. 877 рублей.

250 долларов в месяц имеет и далеко не каждый работник в таких сферах, как сельское хозяйство, образование, культура и искусство, легкая промышленность, если учесть, что средняя зарплата в этих отраслях не дотягивает до 900 тысяч рублей.

Показатель минимальной заработной платы (правда, не в долларовом эквиваленте) был включен и в Основные направления социально-экономического развития. В этом документе указывается, что в 2006-2010 году необходимо будет «повысить поэтапно уровень минимальной заработной платы до уровня минимального потребительского бюджета».

Действующая с 1 января 2010 года минимальная заработная плата равна примерно 259 тыс. рублей, а среднедушевой минимальный потребительский бюджет семьи из четырех человек составляет 440 тыс 600 рублей. То есть пока минимальная зарплата -- это лишь 58% от МПБ.

Кстати, во время апрельского онлайн-опроса Mojazarplata.by, в котором приняли участие около 1200 белорусских респондентов, 10,16% сообщили о том, что их зарплата близка к минимальной, а почти 6% участников опроса и вовсе получают меньше минимальной зарплаты.

Справка «Завтра твоей страны»

На конец января 2010 года, по данным www.mojazarplata.by, минимальная зарплата в Беларуси была меньше, чем в России -- в 1,7 раза, Литве -- в 3,7, Латвии -- в 4, Польше -- уже в 5 раз!

**Ирина ОРЛОВА.**



# РАТУЙЦЕ! КЕПСКІ РЭКОРД

***За мінулы тыдзень, з 19 па 25 ліпеня, у Беларусі ад пападання вады ў дыхальныя шляхі загінула 138 чалавек, у тым ліку сем непаўналетніх. Як паведамілі ў Беларускім рэспубліканскім таварыстве ратавання на водах (Асвод), 113 чалавек патанулі непасрэдна пры купанні ў вадаёмах.***

Разам з тым 83 чалавекі ўдалося выратаваць, а таксама папярэдзіць прыкладна 800 трагедый на вадзе. Спецыялісты адзначаюць, што прычына большасці здарэнняў — парушэнне правілаў бяспечных паводзін на вадзе. Акрамя таго, многія з патанулых знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

На мінулым тыдні ў вадзе загінулі двое двухгадовых дзяцей. Так, у Вёсцы Стары Двор Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці па недаглядзе бацькоў хлопчык упаў у адкрыты люк палівачнага калодзежа і патануў. У Крычаве Магілёўскай вобласці двухгадовая дзяўчынка патанула ў надзіманым басейне, застаўшыся без нагляду бацькоў.

Усяго з пачатку года па 25 ліпеня ў Беларусі патанулі 747 чалавек, уключаючы 58 непаўналетніх. За аналагічны перыяд мінулага года — 474 чалавекі, уключаючы 60 дзяцей. Нагадаем, з 12 па 18 ліпеня ў краіне патанула 145 чалавек. Гэты перыяд стаў рэкордным па колькасці патанулых за апошнія 30 гадоў. Разам з тым з пачатку года 564 чалавекі работнікам Асвода ўдалося выратаваць (540 — летась), паведамляе БелаПАН.

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў
**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742
**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна